ГЦБС г.Гродно

Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка;
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# "ПАКЛІКАНЫ АДРАДЖЭННЕМ"

## Да 120-годдзя Максіма Багдановіча

2011

**Пакліканы адраджэннем: Да 120-годдзя Максіма Багдановіча: сцэнарна-метадычныя матэрыялы ў дапамогу бібліятэкару / Гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна; аддзел бібліятэчнага маркетынгу; укладальнік Н.Ю. Баброва, рэдактар Н.Р. Свірыда. – Гродна, 2011. – 17 с., фота.**

Дадзенае сцэнарна-метадычнае выданне падрыхтавана па матэрыялах крытычных і біяграфічных артыкулаў, створана і выдадзена сіламі бібліятэкараў Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка да 120-годдзя з дня нараджэння вялікага беларускага паэта. У выданні змешчаны сцэнарыі мерапрыемстваў, спісы літаратуры, прысвечаныя М. Багдановічу, а таксама матэрыялы пра ўвасабленне выявы паэта ў мастацтве.

Адрасавана бібліятэкарам, настаўнікам, выхавацелям, метадыстам, чытачам.



*«Максім Багдановіч ратаваў нацыю, ратаваў мову
на краі адчаю. Аднаго жыцця мала, каб дарасці да разумення
Максіма Багдановіча, да разумення ягонай унікальнасці, велічы,
глыбіннай прастаты. Богам дадзены,
каб мы па-багдановічаўску любілі
сваю святую зямлю, імя якой Беларусь...”
Рыгор Барадулін*

Максім Багдановіч…

Кароткі быў яго жыццёвы век. Ён вымяраецца дваццаццю пяццю гадамі. Многія літаратары ў такім узросце толькі пачынаюць тварыць. Ён жа – закончыў. І можа таму што прадчуваў блізкую развязку, спяшаўся, працаваў не шкадуючы сябе: абы паспець сказаць тое, што хвалявала яго сэрца і што не магло не выліцца ў творы.

Толькі пяць гадоў жыў ён у Беларусі. Астатняе жыццё прайшло паза яе межамі. Таму родную мову, на якой рашаецца тварыць, давядзецца вывучаць па бацькавых этнаграфічных запісах ды па кнігах. Творам, якія ён паспеў падарыць народу, выпаў зайздросны лёс: да яго неўміручых радкоў усё з большай сілай цягнуцца шчырыя людскія сэрцы.

9 снежня 2011 года Максіму Багдановічу споўнілася б 120 гадоў. Да юбілею паэта падрыхтавана гэта метадычнае выданне.

Выданне складаецца з наступных матэрыялаў:

- *Біяграфічную даведкі;*
- *Прыкладаў юбілейных выстаў;*
- *Спісу мастацкіх твораў, прысвечаных Багдановічу*
- *Спісу вершаў паэта, якія пакладзены на музыку беларускіх кампазітараў;*
- *Сцэнарыя літаратурна-музычнага вечара;*
- *Конкурсу знаўцаў жыцця і творчасці паэта;*
- *Сцэнарыя літаратурнага мантажу;*
- *Бібліяграфічнага спісу твораў, якія прысвечаны паэту.*

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Максім Адамавіч Багдановіч нарадзіўся ў Мінску 9 снежня 1891 года.

У чэрвені 1892 года сям'я Багдановічаў пераязджае ў Гродна.

У лістападзе 1896 года Багдановічы назаўсёды пакідаюць Беларусь.

У 1902 годзе Максім паступіў у Ніжагародскую мужчынскую гімназію.

6 ліпеня 1907 года ўпершыню ў друку з'яўляецца алегарычнае апавяданне "Музыка" М. Багдановіча.

1908 год – Сям'я пераязджае ў Яраслаўль.

У пачатку вясны 1909 года Максім Багдановіч захварэў на сухоты.

1911 год – Бацька раіў паехаць у Крым, але Максіма цягнула на Беларусь.

Ён марыў вучыцца на філалагічным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта, аднак у Пецярбург не паехаў, а паступіў у Яраслаўскі юрыдычны ліцэй.

Скончыў Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй у Яраслаўлі ў 1916 годзе, пераехаў у Мінск. Працаваў сакратаром губернскай харчовай камісіі.

У 1917 годзе здароўе Максіма пагаршаецца. Ён накіроўваецца ў Крым. Нягледзячы на цяжкі стан здароўя, не кідае працы над складаннем беларускага буквара, ні на хвіліну не забывае пра Беларусь.

25 мая 1917 года ноччу Максім Багдановіч памёр. Пахавалі паэта на могілках, якія знаходзіліся ў гарах, над горадам.

У 1924 годзе беларускія паэты Уладзімір Дубоўка, Анатоль Вольны, Андрэй Александровіч адшукалі магілу паэта, і пазней на ёй быў устаноўлены помнік. На ім - словы:

*“Хоць зерняткі засохшымі былі,*
*Усё ж такі жыццёвая іх сіла*
*Збудзілася і буйна ўскаласіла*
*Парой вясенняй збожжа на раллі”.*

Пры жыцці М.Багдановіч выдаў толькі адзін зборнік вершаў “Вянок” (Вільня, 1913), які стаў унікальнай з’явай у беларускай літаратуры па сваёй эстэтычнай выверанасці, кампазіцыйнай прадуманасці.

Многія вершы М.Багдановіча пакладзены на музыку, вершы “Зорка Венера” і “Слуцкія ткачыхі” бытуюць як народныя песні. Нацыянальнай класікай сталі творы Багдановіча, пакладзеныя на музыку Аладавым М., Лучанком І., Сурусам Р. і інш. Яму прысвечаны опэра «Зорка Венера» (Ю. Семяняка — А. Бачыла) ды поп-опэра «Максім» (І. Палівода — Л. Пранчанка).

Працуюць музеі Багдановіча ў Мінску, Гродна, Яраслаўлі; імя паэта носяць вуліцы ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі, у Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі і Ялце, школы і бібліятэкі ў розных беларускіх гарадах. Вобраз М. Багдановіча ўвасоблены ў шматлікіх жывапісных, графічных, скульптурных творах. Помнікі паэту пастаўлены ў Мінску, Місхоры, Ялце, Яраслаўлі. У 1991 годзе імя Максіма Багдановіча ўнесена ў каляндарны спіс ЮНЭСКА.

## ПРЫКЛАДЫ ЮБІЛЕЙНЫХ ВЫСТАЎ

### “Рыцар роднага слова”

Раздзелы:

1. Нязгасная зорка паэта

Эпіграф:

*Ты прыйшоў*
*І гарачым словам*
*Рунь узняў на роднай зямлі.*
*У. Караткевіч*

У гэтым раздзеле збіраецца літаратура аб жыцці і творчым шляху паэта.

- Адамовіч, Г. Жыцце і творчасць Максіма Багдановіча як прыклад "адарванасці" // Роднае слова.- 2008.- № 4.- С. 3-7.
- Аскірка, В. Вывучэнне біяграфій пісьменнікаў з выкарыстаннем камп'ютэрных тэхналогій // Роднае слова.- 2007.- №4.- С.44-45 .
- Бартохаў, В. Па сцежках Максіма Багдановіча [ў Крыме] // Літаратура і мастацтва.- 2007.- 23 сак.- С.13.
- Ганчарова-Цынкевіч, Т. Гістарычныя погляды Максіма Багдановіча // Родное слова.- 2008.- №8.- жн.- С.22.
- Есіс, Я. Жыццё і творчасць Максіма Багдановіча // Роднае слова.- 2011.- №3.- С.75-77.
- Клышка, А. Цвяток радзімы васілька // Маладосць.- 2010.- № 4.- С. 119-127.
- Кузьміч, М. Жанчыны Багдановіча // Народная газета.- 2006. - Дадат.: Семья.- 9 снеж.- С.7.
- Мацюхіна, Т. Паэзія колераў і пачуццяў // Полымя.- 2008.- № 10.- С.174-182.
- Мацюхіна, Т. Імпрэсіяністычныя тэндэнцыі ў паэзіі Максіма Багдановіча // Роднае слова.- 2010.- №9.- С.19-21.
- Мушынская, Т. Век Багдановіча // Мастацтва.- 2009.- № 3.- С.16-17.
- Чукалін, У. Таямніца аднаго псеўданіма // Літаратура і мастацтва.- 2009.- 10 ліп.- С.14.
- Шаладонаў, І. Мінулае ў мастацкай канцэпцыі часу паэзіі Максіма Багдановіча / І. Шаладонаў // Род. слова. - 2010. - №10. - С. 12-13.

## 2. Раскрыйце мае кнігі…

Эпіграф:

*Беларусь, твой народ дачакаецца*
*Залацістага, яснага дня.*
*Паглядзі, як усход разгараецца.*
*Колькі ў хмарках залётных агня…*
*М. Багдановіч*

Збіраюцца выданні вершаў паэта.

- Багдановіч М. Вянок. Кніжка выбраных вершоў. Вільня, 1913.
- Багдановіч М. Творы. Т. 1-2. Мінск, 1927-1928.
- Багдановіч М. Выбраныя творы. Мінск, 1946.
- Богданович М. Избранные произведения. М., 1953.
- Багдановіч М. Творы. Мінск, 1957.
- Багдановіч М. Збор твораў. Т. 1-2. Мінск, 1968.
- Багдановіч М. Вянок. Кніжка выбраных вершаў. Факсімільнае выданне. Мінск, 1981.
- Багдановіч М. Поўны збор твораў. У 3 т. Мінск, 1992-1995.

- Богдановіч М. Венок. Мн.: Юнацтва, 1985.
- Богданович М. Узор василька. Мн.: Мастацкая літаратура, 1985.

## 3. Цуд паэзіі Багдановіча

Эпіграф:

*І застаўся ты ў нашых душах,*
*Хоць навекі знік у палях,*
*Вечна светлы і вечна дужы,*
*Вечна юны, як наша зямля.*
*У. Караткевіч*

Творы пра Максіма Багдановіча іншых аўтараў.


- Бутэвіч, А. Маладыя гады - маладыя жаданні: п'еса, прысвечаная М. Багдановічу / А. Бутэвіч // Маладосць. - 2007. - №10. - С. 75 - 95.
- Бярозкін, Р. Чалавек напрадвесні: апавяданне пра Максіма Багдановіча / Рыгор Бярозкін. – Мн.: Нар. асвета, 1986. – 176 с.
- Ганчарова-Цынкевіч, Т.У. Максім Багдановіч і беларускае адраджэнне на пачатку ХХ стагоддзя / Т.У. Ганчарова-Цынкевіч; М-ва адукацыі РБ . Бел. дзярж. Ун-т імя М. Танка. – Мн., 1998.
- 4.Зуборев, Л. Максим Богданович: историко-документальная повесть о белорусском песняре и его семье / Л. Зуборев. – Мн.: Беларус. кнігазбор, 2004. – 147 с.
- Мастацкія творы пра Максіма Багдановіча // Беларус. мова і літ. – 1991. – №7. - С. 22.
- Міклашэўскі, Я. Каханне і смерць, або л.с Максіма Багдановіча: раман-даследванне / Я. Міклашэўскі – Мн.: Маст. літ., 2009. – 367 с.: іл.
- Науменко, И. Максим Богданович: главы из книги / Иван Науменко // Нёман. – 1999. -№2. – С.210-237.
- Стральцоў, М. Загадка Багдановіча: аповесць-эсэ / М. Стральцоў // – Мн.: Маст. літ., 1969. – 120 с.
- Стральцоў, М. Загадка Багдановіча: урыўкі з аповесці-эсэ / М. Стральцоў // Полымя. - 2006. - №12. - С.156-164.
- Бензярук, Н. На магіле Багдановіча: верш / Н. Бензярук // Род. слова. - 1996. - №9. - С.208.
- Ждановіч, І. Арлы ірвуць, крывавяць цела: верш / І. Ждановіч // Род. слова. - 1991. - №11. – Ніжняя вокладка.
- Жылка, Ул. Максім Багдановіча: верш / Анталогія беларускага санета/ уклад. і аўт. прадмовы Я. Хвалей – Мн.: Ураджай, 2002. - С.21.
- Дранько-Майсюк, Л. "Багдановіч, ратуй, ...": верш / Л. Дранько-Майсюк // Маладосць. - 2007. - №10. - С. 98.
- Кагановіч, І. Маналог святога Максіма: верш / І. Кагановіч // Маладосць. - 2009. - №9. - С.89 - 90.
- Караткевіч, Ул. Багдановічу: верш / Ул. Караткевіч // Род. слова. -1992. - №11. – С.27.
- Мятліцкі, М. Багдановічу: верш, прысвечаны Максіму Багдановічу / М. Мятліцкі // Полымя. - 2010. - № 1. - С.7.
- Наўроцкі, А. Верш Багдановіча: верш / А. Наўроцкі // Род. слова.- 1995. - № 3. - С. 10.

- Сіпакоў, Я. Я хачу вярнуцца да цябе... : верш / Я. Сіпакоў // Род. слова. - 2001. - № 4. - С. 21.
- Янішчыц, Я. Смерць Максіма Багдановіча: верш, прысвечаны Максіму Багдановічу / Я. Янішчыц // Маладосць. - 2007. - №10. - С.96.

4. Бліскучы перакладчык

Эпіграф:
*Лепшы медзі сабе памятнік справіў я,*
*Болей усіх пірамід царскіх падняўся ён;*
*Не зруйнуе яго сівер, ні едкі дождж,*
*Ні гадоў чарада, вечнага часу рух.*
*Гарацый*

Збіраюцца выданні – пераклады паэта з іншых моў на беларускую.
Гл. ссылку: http://www.maksimbogdanovich.ru/categories/12.htm, дзе сабраны тэксты перакладаў М.Багдановіча.

**"У вянок Багдановічу"**

Раздзелы:

1. Асоба і лёс

*У кожнай літаратуры ёсць свае незагойныя,*
*балючыя раны.*
*У рускай – Пушкін і Лермантаў...*
*У беларускай – Максім Багдановіч.*
*Б. Сачанка*

2. Вершы дзівоснай прыгажосці

*Вазьміце томік яго лірыкі і паспрабуйце*
*прачытаць некалькі вершаў...*
*і вы палюбіце яго самай моцнай любоўю.*
*У. Караткевіч*

3. Сучаснік – назаўжды

*Лёс паэзіі Максіма Багдановіча – лёс сапраўднай паэзіі:*
*чым больш праходзіць часу, тым яна глыбей,*
*па-новаму асэнсоўваецца.*
*Р. Барадулін*

4. Багдановічу прысвячаецца

*Паэт згарэў, як зорка,*
*Пакінуўшы назаўсёды у сэрцах светлы свет.*
*Р. Барадулін*

5. Максім вачыма сучасных мастакоў

## Іншыя назвы выстаў:

- Незабыўны Максім Багдановіч
- Дзіўная зорка Максіма Багдановіча
- Ліра Багдановіча
- Ліра Максіма
- Загадка Максіма
- Ці ведаем Максіма?
- Паэзія – яго душа
- Год пад зоркай Багдановіча
- Жыве Максімава імя!
- Паклон Багдановічу
- Прысвячэнне Багдановічу
- Застаецца ён непаўторным
- Вечна юны, як наша зямля…
- "Я хацеў бы спаткацца з Вамі…"
- Шляхамі Максіма Багдановіча
- Паклон табе, Максіме!
- Вяртанне Максіма.

Імя Максіма Багдановіча назаўсёды ўпісана ў нашу літаратуру. Вобраз яго – невычэрпная крыніца творчасці для жывапісцаў, скульптараў, музыкантаў, паэтаў. Любоў да бацькаўшчыны жывіла высокае натхненне паэта, давала яму сілы здзейсніць свой пісьменніцкі і грамадзянскі подзвіг.

Вуснамі Я.Коласа, Зм.Бядулі, К.Чорнага і многіх іншых беларускіх пісьменнікаў выказана ўсенародная любоў і пашана да таленавіцейшага беларускага паэта М. Багдановіча. Да творчасці М.Багдановіча звярталіся многія беларускія пісьменнікі.

## М. БАГДАНОВІЧ У ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

### *Мастацкія творы пра Максіма Багдановіча*

- Агняцвет Э. "Я хачу, каб ты ведаў": [верш];
- Акулін Э. "Максіму Багдановіу": [верш];
- Александровіч А. "На магілу Максіма Багдановіча": [верш];
- Барадулін Р. "Блакітная легенда": [верш];
- Барадулі Р. "Сакольнік": [верш];
- Бічэль-Загнетва Д. Памяці маці Максіма Багдановіча, Сяброўства, Ракуцёўшчына: [вершы];

- Броўка П. “Памяці паэта”, “Багдановічу”: [верш];
- Бур’ян Б. “Ля сіняй бухты”: [аповесць];
- Бядуля З. Апавяданні-успаміны пра М.Багдановіча;
- Васілёк М. “Памяці Максіма Багдановіча”: [верш];
- Гілевіч Н. “Апошняе спатканне з Веранікай”: [верш];
- Дубоўка У. “Нават мора змяніла свой колер”: [верш];
- Жылка У. “Максіму Багдановічу”: [санет];
- Іпатава В. “Магіла Багдановіча”: [верш];
- Караткевіч У. “Домік Багдановіча”, “Багдановічу”: [вершы];
- Лойка А. “Балада васількоў: Памяці Максіма Багдановіча”: [верш];
- Лось Е. “На ялцінскіх могілках”, “Я ў прыгаршчах прынесла...”: [вершы];
- Лужанін М. “Максімава магіла”: [верш];
- Марціновіч П. “У Вільні каля Вострай Брамы”: [верш];
- Панізнік С. “Зорка Максіма”, “Вечна сіняе неба”, “Помнік у Крыме”: [вершы];
- Пысін А. “Кіпарысы. Смуга. Павалока...”: [верш];
- Танк М. “ Над магілай Багдановіча”: [верш];
- Шушкевіч С. “З крымскага сшытка”: [цыкл вершаў];
- Янішчыц Я. “Ялта – 1917”: [верш].

## БАГДАНОВІЧ І МУЗЫКА

Паэзія М.Багдановіча трывала ўвайшла ў духоўную скарбніцу беларускага народа. Шматлікія творы паэта пакладзены на музыку беларускіх кампазітараў. Творы многіх кампазітараў Беларусі сугучны паэзіі Максіма Багдановіча.

| Твор М. Багдановіча | Песня кампазітара, якую можна выкарыстаць на мерапрыемстве |
|---|---|
| “Зімой” | Равенскі М.Я. “Завіруха”, |
| “Маёвая песня” | Мулявін У.Г. “Па-над белым пухам вішняў” |
| “Слуцкія ткачыхі” | Равенскі М.Я. “Слуцкія ткачыхі”, Мулявін У. Г. “Слуцкія ткачыхі” |
| “Цёплы вечар, ціхі вечар, свежы стог...” | Карызна У.У. “Вечар”, Захлеўны Л.К. “Вакальны цыкл на вершы М.Багдановіча” |
| “Вечар на захадзе ў попеле тушыць...” | Тырманд Э.М. “Вечар”, Карызна У.У. “Вечар” |
| “Раманс” | Сярых В.В. “Рамансы на вершы М. Багдановіча” |

| | |
|---|---|
| “Санет” (“Замерзла ноччу шпаркая крыніца”) | Семяняка Ю.У. “У вянок Максіму Багдановічу”. Па матывах оперы “Зорка Венера” |
| “Пагоня” | Мулявін У.Г. “Пагоня”, Акулін Э. “Пагоня” (ідэйная блізкасць да верша М.Багдановіча) |

## “НЯЗГАСНАЮ ЗОРКАЙ ТЫ Ў НЕБЕ РАДЗІМЫ НАВЕКІ”

Сцэнарый літаратурна-музычнага вечара



*Афармленне: партрэт М.Багдановіча, букеты кветак, свечкі.*
*Дзяўчынкі ў беларускіх касцюмах ...*

1 вядучы: *Чытае верш Васіля Віткі “Вянок”*
*У канцы чытання пачынае ціха гучаць песня Эдуарда Акуліна “Мая Крывія”. Паступовa музыка нарастае.*

2 вядучы: Максім Багдановіч пражыў усяго 25 гадоў, але плёну гэтага жыцця, кароткага і яркага, як бліскавіца, суджана тое даўгалецце, якім лёс надзяляе кожную таленавітую асобу.

*На сцэну выходзяць тры дзяўчынкі і чытаюць:*

1-я. Я не ўсё, што хацела, сказала,
У нашых сэрцах жывеш ты, павер.
І кахання, што знаў гэтак мала,
У цябе вельмі многа цяпер.

2-я. І твае чарадзейныя словы
Даказалі даўно ўсяму свету,
Як пяшчотна гучыць наша мова
У сапраўдных вялікіх паэтаў.

3-я. Беларусы табой ганарацца,
Тут імя тваё дорага ўсім,
І так хораша нам называцца
Землякамі тваімі, Максім.

1 вядучы: Класік беларускай літаратуры Максім Багдановіч нарадзіўся 9 снежня 1891 г. у горадзе Мінску ў сям'і педагога, вучонага - этнографа. 4 кастрычніка 1896 г. памірае маці будучага паэта. Праз месяц бацька паэта назаўсёды пакідае Беларусь і пасяляецца ў Ніжнім Ноўгарадзе, затым – у Яраслаўлі. Хлопчыку было ў гэты час 5 гадоў.

2 вядучы: Кнігі ў бібліятэцы бацькі сталі той крыніцай, што жывіла ўяўленні Максіма пра далёкую Радзіму. І яшчэ характар, пра які бацька сказаў: "У працы быў настойлівы і ўпарты. Захоплены якойсьці мэтай, ён цвёрда і няўхільна імкнуўся да яе здзяйснення… З той жа ўпартасцю ён адносіўся і да вывучэння беларускай мовы і да напісання вершаў на ёй…"

*Гучыць песня Э.Акуліна "Зорка Максіма.*

1 вядучы: Першым друкаваным творам 16-гадовага юнака стала казка "Музыка" – твор аб неўміручасці народнага мастацтва, аб вернасці мастака свайму народу. І сам Максім Багдановіч, як той музыка, на берагах далёкай Волгі пачаў складаць натхнёныя гімны Беларусі, япавяў хараство яе прыроды, прыгажосць яе народа.

*Выходзяць два чытачы. Яны чытаюць вершы М. Багдановіча "Добрай ночы, зара-зарніца!" і "Прывет табе, жыццё на волі!".*
*Гучыць раманс "Над возерам" (верш М.Багдановіча, муз. Я. Дзягцярыка).*

2 вядучы: Тэма прыроды – адна з вядучых у лірыцы Максіма Багдановіча. Шчыра радаваўся паэт прыгажосці роднага краю – красе веснавога цвіцення, непаўторнасці летняга вечара, вячэрняму пейзажу зімовай дарогі…

*Зноў вяртаюцца чытачы і выконваюць вершы М. Багдановіча "Маёвая песня" і "Цёплы вечар". Гучыць мелодыя на выбар – "Зімой", "Завіруха", "Напілося сонца"муз. Э. Тырманд або "Астры", "Вечар" муз. А Туранкова.*

1 вядучы: У 1911 годзе Максім Багдановіч упершыню наведаў Беларусь. Два месяцы працягвалася знаёмства з Радзімай. І малады паэт шчыра расказаў пра народнае гора ў сваіх пранікнёных вершах.

*Гучыць верш "Краю мой родны! Як выкляты богам…"*

2 вядучы: Але паэт верыў у блізкае абнаўленне свету. Ахоплены рэвалюцыйным прадчуваннем, ён, прараканючы, пісаў:

*Беларусь, твой народ дачакаецца*
*Залацістага, яснага дня,*
*Паглядзі, як усход разгараецца,*
*Сколькі ў хмарках залётных агня.*




*Гучыць песня Э. Акуліна "Гэй, Беларус".*

1 вядучы: Багдановічу не суджана было дачакацца "залацістага, яснага дня". Ён памер 25 мая 1917 года ў Ялце, куды мінскія сябры адправілі яго на лячэнне. Адзіным суцяшэннем яму ў апошнія дні быў зборнік вершаў "Вянок" як сведчанне таго, што жыццё пражыта не дарэмна. Пра яго пісаў паэт у сваім апошнім вершы:

*У краіне светлай, дзе я ўміраю,*
*У белым доме ля сіняй бухты,*
*Я не самотны, я кнігу маю*
*З друкарні пана Марціна Кухты.*

*Выходзяць дзяўчаты і чытаюць верш*
*Д. Бічэль-Загнетавай "Ракуцёўшчына. 31 мая 1987".*

1-я. Хто нашу зямельку адновіць,
Верне яе блакіту бязмеры?
Глядзіць у вочы Максім Багдановіч
Вачамі зоркі Венеры.

2-я. Хто нашу мову замовіць
Ад вуснаў злых, нечытэльнай паперы?
Глядзіць у вочы Максім Багдановіч
З надзеяй зоркі Венеры.

3-я. Хто нашы душы заслоніць?
У душы дзяцей хто ўкладзе крыху веры?
Гарыць высока Максім Багдановіч
Ясным агнём зоркі Венеры.

*Гучыць раманс “Зорка Венера”.*

1 вядучы: Усяго дзесяць гадоў доўжылася дзейнасць таленавітага сына беларускай зямлі. Але, нягледзячы на пакутлівае і такое бязлітасна кароткае жыццё, Багдановіч – гэта зорка для Беларусі, бо ў яго вершах – душа народа.

2 вядучы: Жыццё беларускага народа трывала ўвайшло ў асабістае жыццё творцы, назаўсёды запаліўшы зорку паэта на небасхіле роднага краю, зорку, якая стала незгасальнай. Абудзіць святое сумленне ў людзей і прыходзіў на пакутную беларускую зямлю, прыходзіў каб да канца споўніць свой апостальскі доўг.

## КОНКУРС ЗНАЎЦАЎ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ ПАЭТА “А СЭРЦА ІМКНЕЦЦА ДА БАЦЬКАВАГА КРАЮ”

1. У якіх беларускіх гарадах жыла сям'я Багдановічаў? (*Мінск, Гародня*).
2. Як вы лічыце, якія кветкі больш любіў Багдановіч і якія б маглі сімвалізаваць яго творчасць? *(Васількі).*
3. У апошнія дні свайго жыцця Максім Багдановіч займаўся дзейнасцю, якая мела дачыненне да дзяцей. Над чым працаваў паэту гэты час? (*Над стварэннем беларускага буквара).*
4. У якіх рускіх гарадах жыла сям'я Багдановічаў? (*Ніжні Ноўгарад, Яраслаўль*).
5. Як пачынаецца адзін з найвядомейшых яго вершаў, які мае назву «Раманс»? *(«Зорка Венера ўзыйшла над зямлёю...»).*
6. Як вы лічыце, які час быў любімым часам сутак Багдановіча? (*Адвячорак).*
7. Дзе памёр Багдановіч і дзе ён пахаваны? (*У Ялце).*
8. Як называецца паэма-казка Максіма Багдановіча? *(«Мушка-зелянушка і Камарык-насаты тварык»).*
9. Якое дачыненне да паэта мае чалавек, прозвішча якога - Вакар? *(Гэта скульптар, аўтар помніка Максіму Багдановічу).*
10. Дзе знаходзіцца помнік Максіму Багдановічу? *(У парку каля Тэатра оперы і балета, г.Мінск).*

11. Імя Максім асацыіруецца ў беларускай літаратуры перш за ўсё з прозвішчам Багдановіч. Але значнае месца ў ёй займаюць і іншыя пісьменнікі, якія насілі і носяць гэтае імя. Назавіце іх *(Гарэцкі, Лужанін, Танк*).
12. Хто з беларускіх паэтаў мае сходны з Багдановічам трагічны лёс? *(Паўлюк Трус).*
13. Як ушанавана памяць аб М.Багдановічу ў нашым горадзе? (*Ёсць цудоўны музей, вуліца, шыльда на доме, дзе ён жыў).*
14. З якім выдатным рускім пісьменнікам Багдановіч меў сваяцкія адносіны? (*З М. Горкім).*
15. Пры жыцці паэта выйшаў толькі адзін зборнік вершаў. Як ён называецца? *(«Вянок»).*
16. Як называецца вершаванае апавяданне, на словы якога была напісана музыка, і выконвалася «Песнярамі»? *(«Вераніка»).*
17. У Багдановіча ёсць верш, які мае такую ж назву, як вядомы беларускі танец? *("Лявоніха").*

## **"ЖЫВЕ МАКСІМАВА ІМЯ"**
*Літаратурны мантаж*



*У чытальнай зале – выстава кніг М.Багдановіча,*
*выстава рэпрадукцый мастакоў.*

*Уплыў М.Багдановіча на беларускую паэзію*
*і шырэй – на ўсю мастацкую культуру Беларусі*
*велізарны,*
*таму што гэта быў вялікі, самабытны,*
*шматгранны,*
*глыбокі і прынцыпіяльны талент...*
*Н. Гілевіч*

*Словы бібліятэкара:*

Імя Максіма Багдановіча назаўсёды ўпісана ў нашу літаратуру. Вобраз яго — невычэрпная крыніца творчасці для жывапісцаў, скульптараў, музыкантаў, паэтаў. Любоў да Бацькаўшчыны жывіла высокае натхненне паэта, давала яму сілы здзейсніць свой пісьменніцкі і грамадзянскі подзвіг.

Вуснамі Я. Коласа, Зм. Бядулі, К. Чорнага і многіх іншых

беларускіх пісьменнікаў выказана ўсенародная любоў і пашана да таленавіцейшага беларускага паэта М. Багдановіча. «Выдатнейшы паэт і крытык» (Я. Колас), «Вялікі грамадзянін і патрыёт радзімы» (К. Чорны) — так характарызавалі яго першакласныя майстры слова.

Да творчасці М. Багдановіча звярталіся і зараз звяртаюцца многія беларускія пісьменнікі. Вось якія цудоўныя творы прысвечаны нашаму таленавітаму земляку.

*1-шы дэкламатар:*

«Ёсць паэты, якія пішуць творы, каб потым з іх выдаць выбранае, але ёсць і паэты, што пішуць толькі выбранае. Да такіх і належыць Максім Багдановіч» (М. Танк).

*Гучыць верш Васіля Віткі «Вянок»:*

*Мова дадзена — не маўчаць.*
*Мова дадзена — мовіць.*
*Не кладзіце нябыту пячаць*
*На паэтаву споведзь.*
*Не на глум, не на злом,*
*Не для немачы ў горле,*
*Ён радзіўся арлом*
*З крыллем орлім,*
*А дзе тыя арлы*
*У нас, на Белае Русі? —*
*запытаеце вы.*
*Адказаць ён сам мусіў,*
*Як глытаў з крымскіх гор*
*Горкі пах палыновы,*
*Бачыў родны прастор*
*І вянок свой цярновы.*

*2-гі дэкламатар:*

«Паэт усеабдымнага ахопу жыцця, Максім Багдановіч блізкі нам сваёй актыўнасцю, бясстрашшам зазірнуць у любыя яго праявы — у высокае і нізкае, гераічнае і трагічнае, у самыя вострыя надзённыя і так званыя вечныя тэмы» (А. Лойка).

*Гучыць верш Я. Сіпакова «Ялта, Максім, кіпарысы...»:*

*Ён навучыў, здаецца, гаварыць*
*Па-беларуску нават кіпарысы,*
*Барвінак на магільніку гарыстым*
*Ён навучыў, здаецца, гаварыць.*
*Паўднёва сонца плавіцца ўгары,*
*Зямля гарачая, нібыта прысак...*
*Ён навучыў, здаецца, гаварыць*
*Па-беларуску нават кіпарысы.*

*3-ці дэкламатар*:

«Багдановічаўскі «Вянок» здаецца неперасягнутым узорам цэльнасці лірычнай кнігі. Кніга чытаецца так, як быццам мае яна своеасаблівы лірычны сюжэт. З кожным новым вершам паэт усё глыбей і паўней раскрывае свет, змешчаны ў сябе свет, які акружае яго рэальна, і свет, што існуе толькі ва ўяўленні» (М. Лужанін).

*Гучыць верш Мар'яна Дуксы «...Не згасне ў Бацькаўшчыну вера...»:*

*Не згасне ў Бацькаўшчыну вера,*
*ў яе вясну, у спеў шпачыны,*
*пакуль Максімава Венера*
*гарыць над хатамі Айчыны.*
*Мы слабыя. Нам вельмі горка.*
*Нас ці ўратуюць песні-лекі?*
*Хай дапаможа наша Зорка —*
*не выйдзем з-пад яе апекі.*
*Мы заўтра ўзнімемся на ногі —*
*ажывяць родныя крыніцы.*
*А як нам выйсці на дарогу,*
*падкажа шчырая Дзянніца.*
*І блаславіць яна Світанак*
*буслінага святога краю,*
*яго марудны, доўгі ранак*
*хай пройдзе і святлом зайграе.*
*Як майскі гром у атмасферы,*
*празвоніць пошчак абуджэння.*
*Бо ёсць Максімава Венера —*
*нябесны компас Адраджэння.*

*4-ты дэкламатар*:

«Багдановіч, побач з Купалам і Коласам, — тое трэцяе вымярэнне, без якога немагчыма перспектыва. З Багдановічам нам стала далёка відаць ва ўсе канцы свету» (М. Стральцоў).

*Гучыць верш У. Мазго «Свята паэзіі ў Ракуцёўшчыне»:*

*Мы прыедзем у гэты куток —*
*Хто мы ёсць на зямлі —*
*Не забыцца,*
*Свой адчуць спакон вечны выток*
*І табе яшчэ раз пакланіцца.*
*Развярэджанай памяці млын*
*Перамеле журбу нашу. Верым*
*Мы не ў горкую зорку Палын,*
*А ў святло незгасальнай Венеры.*
*Каб, далёкі ад ядзерных зім,*
*Родны кут адраджаўся вясновы,*
*Нашы душы адтаюць, Максім,*
*Ад твайго пранікнёнага слова.*
*Будуць доўга ў прасторах лунаць*

*Незабыўныя вершы І песні.*
*Каму лёс на чужыне канаць —*
*На радзіме сваёй уваскрэсне.*
*Дагарыць у кастры бервяно*
*Не адно*
*На паляне вялікай.*
*Здыме сонца, нібыта вянок,*
*З вечаровых нябес Вераніка...*

*Гучыць мелодыя твора І. Лучанка «Вераніка».*

*Словы бібліятэкара*:

Многія беларускія паэты прысвяцілі свае творы М. Багдановічу — А. Александровіч, М. Аўрамчык, Р. Барадулін, Н. Гілевіч, Г. Глебка, У. Дубоўка, А. Лойка, Е. Лось, П. Пестрак, П. Трус, Б. Мікуліч, Б. Бур'ян. Яўген Міклашэўскі напісаў раман-даследаванне «Каханне і смерць, або Лёс М. Багдановіча»; А. Бачыла — лібрэта оперы «Зорка Венера» і паэму «Хмары над бухтай». М. Танк адзначаў: «Геніяльнае пачуццё мастака дапамагло яму спазнаць красу і сілу беларускага слова, адчуць праз яго самую душу народа, палюбіць яго вялікай і балючай любоўю і аддаць яму да рэшты сваё наўздзіў шчодрае сэрца песняра і грамадзяніна...

Пры яго жыцці выйшла толькі адна, даволі сціплая па памеры кніжачка вершаў — «Вянок». Але кветкі, сабраныя ў тым вянку, не завялі. Наадварот, з гадамі, з дзесяцігоддзямі яны ззяюць усё ярчэй. Да яго неўміручых твораў, як да крыніцы з гаючай вадою, цягнецца ўсё больш людзей і ўсё большая да яго пашана і ўдзячнасць нашчадкаў».

*У час чытання верша Я. Янішчыц ціха гучыць мелодыя раманса «Зорка Венера» А. Багатырова.*

*Гучыць верш Яўгеніі Янішчыц «Ялта — 1917»:*

*Чысты погляд васілька*
*Ціха журыцца радзіме.*
*Роднае поле радка*
*Ці не з табою, Максіме?*
*Чую, як мора шуміць.*
*Хваля тугі не адніме.*
*Хочацца верыць і жыць*
*Ці не табе, Максіме?*
*Белай самоты сцяна,*
*Дай яму лёту і сілы!*
*Ці не з журбы Лесуна*
*У Лебедзя гордыя крылы...*
*Скруха душу апячэ,*
*А ці ўзніме нягода.*
*Гэта спяшаецца Чэсць*
*У абарону народа.*
*Смерць, ты цікуеш дарма,*
*Белых галінак кіпенне.*

*Смерці паэта няма —*
*Ёсць Нараджэнне!*
*Песняй абвостраны слых.*
*Чуеш, Максім? — не ўмірае!*
*Гэта з табой. 1 для ўсіх*
*Зорка Венера світае.*

*Словы бібліятэкара:*

Паэзія М. Багдановіча трывала ўвайшла ў духоўную скарбніцу беларускага народа.

Шматлікія творы паэта пакладзены на музыку беларускіх кампазіратаў: М. Аладава, Л. Абеліёвіча, А. Багатырова, Л. Захлеўнага, І. Лучанка, С. Палонскага, Г. Сураса, А. Туранкова, Э. Тырманда, М. Шчаглова («Пагоня»); некаторыя песні бытуюць як народныя («Зорка Венера», «Слуцкія ткачыхі»). Паводле жыцця і творчасці М. Багдановіча створана опера «Зорка Венера» (кампазітар Ю. Семяняка, лібрэта А. Бачылы, паст. у 1970). Яго вобраз увасоблены ў жывапісных, графічных і скульптурных творах С. Вакара, Г. Вашчанкі, П. Драчова, А. Лапіцкай, М. Маназсона, А. Марачкіна, А. Мятліцкага, І. Раманоўскага, Р. Сітніцы і іншых.

Імем паэта названы вуліцы ў Мінску, Яраслаўлі, Гродне, Гомелі, Быхаве, Чэхаве (б. Аутка), школа і бібліятэка ў Мінску. Засведчылі месцазнаходжанне паэта мемарыяльныя дошкі ў Мінску, Гродне, Вяззе, Горкім, Яраслаўлі, Ялце, Чэхаве. Помнікі М. Багдановічу пастаўлены ў Місхоры (1957) і Мінску (1981), мемарыяльны знак — у Ракуцёўшчыне (1977), дзе праводзяцца прысвечаныя М. Багдановічу Рэспубліканскія святы паэзіі. Там жа разбіты «Сад Максіма».

*5-ты дэкламатар* чытае верш Рыгора Барадуліна «Вяртанне Максіма»:

*Якраз гулянку справіў пан Падвйі.*
*Дадому дачакаўшыся Максіма.*
*Не суровей, сцюдзёны суравей,*
*Зірні на свет ягонымі вачыма.*
*Праз дзевяноста год, Бы ў забыцці,*
*Ідзе паэт па змененаму Менску,*
*Між камяніцаў хочацца знайсці*
*Драўляны дом,*
*Як той дубок на ўзлеску.*
*Яму паабяцаў Сяргей Вакар,*
*Які змушае камень засмяяцца,*
*Што дом свой*
*Знойдзе блізка гаспадар,*

*Ды некуды надоўга знік дарадца.*
*Не рада Свіслач ледзяным плытам,*
*Нахмурыўся брывамі голля шэрас*
*Падацца б на Захар'еўскую —*
*Там чакае маладая Зоська Верас...*
*Так і стаяў,*
*Пакуль яго ўначы*
*Не ўбранзавела вопратка ад стыні,*
*Снег не растаў і ўранні на плячы.*
*Як і належыць снегу на вяршыні.*

## СПІС СЦЭНАРНЫХ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

(прыводзіцца літаратура апошніх гадоў выдання, якую можна выкарыстоўваць пры падрыхтоўцы мерапрыемстваў)


- Адамовіч, Г. Жыцце і творчасць Максіма Багдановіча як прыклад "адарванасці" // Роднае слова. - 2008. - № 4. - С. 3-7.
- Аскірка В. Вывучэнне біяграфій пісьменнікаў з выкарыстаннем камп'ютэрных тэхналогій // Роднае слова. - 2007. - №4. - С. 44-45.
- Бартохаў, В. Па сцежках Максіма Багдановіча [ў Крыме] // Літаратура і мастацтва. - 2007. - 23 сак. - С.13.
- Бачыла, А. Дарогамі Максіма Багдановіча // Бачыла, А. Радзіма мая дарагая : вершы, эсэ / Алесь Бачыла. - Мінск, 2009. - С. 75-188.
- Бутэвіч, А. Маладыя гады - маладыя жаданні // Маладосць. - 2007. - № 10. - С.75-94.
- Вабішчэвіч, Т. Лірыка Максіма Багдановіча ва ўспрыманні нашаніўскіх сучаснікаў // Роднае слова. - 2010. - № 8. - С.35-39.
- Валасок, В. Максім Багдановіч. "Раманс" // Роднае слова. - 2008. - № 5. - С. 18-20.
- Васючэнка, П. Максім Багдановіч і сімвалізм // Роднае слова. - 2007. - №5. - С. 3-5.
- Ганчарова-Цынкевіч, Т. Гістарычныя погляды Максіма Багдановіча // Роднае слова. - 2008. - №8. - С.22.
- Герасімовіч В. Незабыўны Максім Багдановіч: літаратурная вечарына, прысвечаная 115-годдзю з дня нараджэння паэта // Бібліятэка прапануе. - 2006. - №5. - С.13-15.
- Грыдзюшка, Т. Прыгажосць і гармонія карцін прыроды ў вершы "Зімой" Максіма Багдановіча // Роднае слова. - 2010. - № 2. - С. 78-79.
- Есіс Я. Жыццё і творчасць Максіма Багдановіча: урок беларускай літаратуры (IX клас). – Роднае слова. - 2011. - №3. - С. 75-77.
- Карзанава А. Дзіўная зорка Максіма Багдановіча: літаратурны вечар // Бібліятэка прапануе. - 2001. - №4. - С. 12-15.

- Клышка, А. Цвяток радзімы васілька // Маладосць. - 2010. - № 4. - С. 119-127.
- Клышка, А. "Здароў, марозны, звонкі вечар!" // Роднае слова. - 2010. - № 4. - С. 21-22.
- Кузьміч, М. Жанчыны Багдановіча // Народная газета. - 2006. - Дадат.: Семья. - 9 снеж. - С.7.
- Максім Багдановіч: старонкі лёсу і творчасці [Тэкст]: бібліяграфічны спіс літаратуры да 120-годдзя паэта (1891-1917) / Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка; уклад. Д.У.Крачко. - Гродна, 2011. - 8 с.
- Мацюхіна, Т Паэзія колераў і пачуццяў // Полымя. - 2008. - № 10. - С.174-182.
- Мацюхіна, Т. Імпрэсіяністычныя тэндэнцыі ў паэзіі Максіма Багдановіча // Роднае слова. - 2010. - №9. - С.19-21.
- Мушынская, Т. Век Багдановіча // Мастацтва. - 2009. - № 3. - С.16-17.
- Мышкавец, І. Вядомыя і невядомыя лёсы "Вянкоў" Максіма Багдановіча // Роднае слова. - 2010. - № 2. - С. 12-14.
- Пятрова, С. Пад зоркай Багдановіча // Літаратура і мастацтва. - 2010. - 17 верас. - С.4.
- Трус, М. Венскае выданне брашуры Максіма Багдановіча "Бела-рускае адраджэнне" (1916): вядомае і невядомае // Роднае слова. - 2009. - № 1. - С.28-31.
- Фоменкова, И. Венок любви // Гродз. праўда. - 2008. - 6 снеж. - С.5.
- Чукалін, У. Таямніца аднаго псеўданіма // Літаратура і мастацтва. - 2009. - 10 ліп. - С.14.
- Шпак Я. Нязгаснаю зоркай ты ў небе Радзімы навекі : літаратурна-музычны вечар па творчасці М. Багдановіча // Бібліятэка прапануе. - 2003. - №5. - С. 14-17.
- "Паэт красы і гармоніі": да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (1891-1917) [Электронны рэсурс] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; адк. за выпуск Л.В.Гарбачова. - 1 электрон. апт. дыск CD-ROM/- 2011.

## ВОБРАЗ ПАЭТА Ў СКУЛЬПТУРЫ

### Помнік паэту ў Мінску



*Даведка: Устаноўлены ў скверы на плошчы П. Камуны, перад тэатрам оперы і балету, недалёка ад месца, дзе стаяла хата, у якой нарадзіўся і жыў паэт. Адкрыты 9 снежня 1981 г. у дзень 90-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча. Аўтары помніка скульптар С. Вакар, архітэктары Ю. Казакоў, Л. Маскалевіч. Бронзавая статуя паэта вышынёй 4,6 м. усталявана на пастаменце з чырвонага граніту. Паэт намаляваны са скрыжаванымі на грудзі рукамі, у правай руцэ букет васількоў - кветак, апетых у яго паэзіі.*

### Помнік паэту ў Яраслаўлі



*Даведка: Помнік паэту, які вучыўся ў сценах Яраслаўскай гімназіі ў 1908-1916 гадах. Чырвоная (Сямёнаўская) плошча. Сквер каля ўваходу ў галоўны корпус Дзямідаўскага ўніверсітэта. Бронза, усталяваны ў 1994 году, скульптар Вакар С.*

### Помнік на магіле М. Багдановіча ў Ялце



*Даведка: Да дзесяцігоддзя з дня смерці паэта на яго магіле ў г. Ялта сіламі гараджан быў усталяваны абеліск з шэрага і светла-карычневага вапняку. Зусім нядаўна быў усталяваны новы манумент (на здымку), у падножжа помніка - кветкі, вянкі, нацыянальная сімволіка Беларусі. На шэрым надмагіллі — імя, дата смерці і страфа з яго санета «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі» пра нязгаслую сілу, якая рвецца да святла і сонцу. У 12 кіламетрах ад Ялты, у Місхоры, на тэрыторыі санаторыя «Беларусь» збудаваны помнік - бюст выбітнага беларускага паэта..*

## Мемарыяльная дошка на Дзяулінскай гасцініцы ў Ніжнім Ноўгарадзе




Даведка: Адкрыта 6 студзеня 1984 г. Мемарыяльная дошка выканана ў выглядзе разгорнутай кнігі. На правай старонцы - барэльеф Багдановіча, на левай - бронзавымі літарамі выкладзены тэкст: "У гэтым будынку былой Ніжагародскай гімназіі ў 1902-1908 гадах вучыўся выбітны Беларускі паэт Максім Багдановіч". Скульптар Вакар С.М.



**Помнік айцу паэта Адаму Ягоравічу Багдановічу,** *вядомаму этнографу і гісторыку, які нарадзіўся, жыў і настаўнічаў у Халапенічах. Сквер у Халапенічах Мінскай вобласці.*

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ У ІНТЭРНЭЦЕ

Пачынаючы пошук інфармацыі ў сусветнай павуціне, трэба належным чынам аформіць пошуковы запыт з тым, каб атрымаць найбольш рэлевантную выбарку. У выпадку з М. Багдановічам мэтазгодна ўводзіць імя і прозвішча “Максім Багдановіч” (двукоссі патрэбныя, каб імя і прозвішча шукаліся разам, а не па асобку).

Пры пошуку любой інфармацыі праз Google часта наверсе аказваецца ***Вікіпедыя*** – шматмоўная, свабодная інтэрнэт-энцыклапедыя. Артыкул пра М.Багдановіча найбольш поўна распрацаваны ў Вікіпедыі на тарашкевіцы. Матэрыял змяшчае наступныя раздзелы: 1.*Біяграфія; 2.Сьмерць паэта; 3.Зьнешнасць Максіма Багдановіча; 4.Творчая спадчына; 5.Перакладчыцкая дзейнасць Максіма Багдановіча; 6.Багдановіч і сучаснасць (інфармацыя пра вуліцы, музеі, спектаклі, помнікі); 7.Бібліяграфія; 8.Крыніцы і заўвагі; 9.Літаратура; 10.Вонкавыя спасылкі* (спасылкі на іншыя інтэрнэт-рэсурсы, на якіх можна атрымаць інфармацыю пра М. Багдановіча). Вікіпедыя таксама змяшчае інфармацыю пра М.Багдановіча на эсперанта, англійскай, башкірскай, іспанскай, англійскай, лацінскай, нямецкай, польскай, украінскай, фінскай, французскай мовах.

Арыгінал адзінага прыжыццёвага зборніка “Вянок” можна знайсці па адрасе: http://asvieta.net/vianok.html.

Найбольш распрацаваным рэсурсам з’яўляецца сайт, прысвечаны творчасці М.Багдановіча, які можна знайсці па адрасе: http://maksimbogdanovich.ru . Сайт падзеляны на лагічныя раздзелы:

*Главная* – раздзел змяшчае спіс твораў пісьменніка, разнесеных па падраздзелах.; *Биогафия* – змешчана даволі падрабязная біяграфія з пазнакай у канцы, што пры падрыхтоўцы тэксту выкарыстоўваліся матэрыялы сайта Дзяржаўнай архіўнай службы РБ http://archives.gov.by.;

*Об авторе* – утрымлівае шэраг артыкулаў розных аўтараў пра творчасць і асобу М.Багдановіча; *Портреты* – змяшчае фотаздымкі і партрэты М.Багдановіча, яго сям’і і дома, дзе ён нарадзіўся; *Музеи* – інфармацыя пра музеі М.Багдановіча*; Библиография*; *Памятники* – інфармацыя пра поммнікі ў Яраслаўлі, Ялце, Мінску і.г.д.

Не абышоў увагай М. Багдановіча і папулярны відэа-рэсурс ***YouTube.*** На старонках гэтага сэрвісу можна знайсці відэа з песнямі на словы Багдановіча і іншыя матэрыялы.

З усіх музеяў Максіма Багдановіча толькі музей ў Гродна мае сваю старонку ў сеціве: http://bogdanovich.grodno.by.

Укладальнік: Н.Ю. Баброва
Рэдактар: Н.Р. Свірыда
Адказны за выпуск: М.А. Камарова

## ЗМЕСТ


- Кароткая біяграфічная даведка……………………………………..1
- Прыклады юбілейных выстаў………..………………………………2
- М.Багдановіч у творчасці беларускіх пісьменнікаў……………6
- М. Багдановіч і музыка…………………………………………………..7
- “Нязгаснаю зоркай ты ў небе Радзімы навекі”: сцэнарый літаратурна-музычнага вечара………………………………...............8
- “А сэрца імкнецца да бацькавага краю”: конкурс знаўцаў жыцця і творчасці паэта……………………………..…………………11
- “Жыве Максімава імя”: сцэнарый літаратурнага мантажу.12
- Спіс сцэнарных і літаратуразнаўчых матэрыялаў ……………17
- Вобраз паэта ў скульптуры ……………………………………….…19
- М. Багдановіч у інтэрнэце………………………………………………20